Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-11-02

Да знамянальнай даты — 100-годдзя з дня нараджэння Ю. Пшыркова — у ЦНБ НАН Беларусі арганізавана юбілейная экспазіцыя “Руплівы даследчык літаратурнай спадчыны”, якая дае ўнікальную магчымасць зазірнуць у творчую майстэрню вучонага, літаратара, педагога, пазнаёміцца з рэдкімі, цікавымі дакументамі і фатаграфіямі з яго асабістага фонду, эпісталярыем, што налічвае больш як 200 адрасатаў, багатай рукапіснай і друкаванай спадчынай. Фонд Ю. Пшыркова налічвае амаль паўтары тысячы адзінак захавання за 1861 — 1983 гг., у якіх утрымліваюцца надзвычай цікавыя матэрыялы, што адлюстроўваюць яго біяграфію, творчую і службовую дзейнасць. Яны ўводзяць у свет яго захапленняў, знаёмяць з калекцыямі персаналій, аўтографаў, якую складаюць сабраныя вучоным з розных крыніц арыгінальныя творы пісьменнікаў, лісты. Выклікае цікавасць эпісталярная спадчына Ю. Пшыркова, а таксама фатаграфіі, у тым ліку вучоных, пісьменнікаў, артыстаў.

**Марына ЛІС**

Марына Ліс. З-пад пяра